*Т. І. Доўнар*

# ВЫТОКІ БЕЛАРУСКАГА ПАРЛАМЕНТАРЫЗМУ

Мінулае з'яўляецца неад'емным багаццем народа, фактарам яго нацыянальнай адметнасці. Беларускі народ мае слаўную і багатую гісторыю, якой можна ганарыцца. Вытокі беларускага парламентарызму знаходзяцца ў далёкай старажытнасці. Шматлікія гістарычныя дакументы сведчаць, што з даўніх часоў насельніцтва старажытных беларускіх дзяржаў (Полацкай, Віцебскай, Пінскай, Смаленскай і інш.) збіралася для вырашэння важных жыццёвых пытанняў на сходы, якія называліся веча, соймы, копы і інш. Як правіла, яны склікаліся з мэтай выбрання князя, разгляду пытанняў вайны і міру, прызначэння падаткаў і інш. Веча (соймы) на Беларусі працягвалі дзейнічаць і ў перыяд фарміравання Вялікага княства Літоўскага, у сувязі з чым вучоныя адзначалі, што агульнадзяржаўны (вальны) сойм вырас са старажытных вечавых сходаў.

Водгукі старажытных вечавых парадкаў бачны ў заканадаўстве Вялікага княства Літоўскага, у першую чаргу ў абласных граматах. Вялікія князі выдавалі абласныя граматы пры ўваходзе зямель (княстваў) у склад новай дзяржавы. Аднак да нашага часу дайшлі больш познія, пацвярджальныя граматы (Полацкай зямлі 1511, 1547, 1580, 1634 гг., Віцебскай зямлі 1503, 1509, 1561 гг., Смаленскай зямлі 1505 г., Драгічынскай зямлі 1511, 1547 гг. і інш.), якія мелі сілу і значэнне мясцовых законаў. Разам з тым, яны рэгламентавалі ўзаемаадносіны мясцовага кіраўніцтва з кіраўніцтвам Вялікага княства і з'ўляліся вынікам кампрамісу паміж цэнтральнай уладай і насельніцтвам гэтых старажытных княстваў. Так, вялікі князь абяцаў не ўмешвацца ў царкоўныя і судовыя справы гэтых зямель; прызначаў ваяводу са згоды насельніцтва, вызваляў жыхароў ад шэрага павіннасцей; прызнаваў за імі права свабоднага выезду з тэрыторыі дзяржавы і інш. Так, у Полацкай грамаце 1511 г. гаварылася: «Теж полочаном всим жити в Полоцку добровольно, покуль хто хочет; а будеть ли которому Полочанину от нас насильство, нам его силою не держати: ино ему путь чист, куды хто хочеть, без каждое зачепки»[1]. Такім чынам, гэтыя землі былі аўтаномнымі ў складзе Вялікага княства Літоўскага, карысталіся асаблівымі правамі і ільготамі. Менавіта пра гэта сведчыць і

даволі працяглая дзейнасць мясцовых соймаў, якія і сталі галоўным узорам для ўтварэння вальнага сойму.

Вучоныя па-рознаму ставіліся да прычын і перыяду ўзнікнення агульнадзяржаўнага сойма. Так, М. К. Любаўскі адзначаў, што вялікакняжацкая дума (паны-рада), якая стала асновай сойму, у XIV ст. яшчэ не ўяўляла сабой дакладна вызначанай арганізацыі. Вялікі князь прызываў на нарады ўдзельных князёў і баяр, аднак удзел апошніх быў абмежаваным. Нават Вітаўт выбіраў сабе дарадчыкаў па ўласнаму жаданню, хаця менавіта пры ім вызначылася кола асобаў, з якімі ён раіўся часцей за іншых і перш за ўсё імі былі кіраўнікі так званых абласцей – старажытных княстваў (зямель). Вучоны сцвярджае, што канчатковы склад рады вызначыўся толькі ў сярэдзіне XV ст. пры вялікім князі Казіміры, калі яна пераўтварылася з асабістай рады князя ў агульнадзяржаўны орган[2]. Пры Аляксандры ў склад рады ўваходзяць: чатыры каталіцкія біскупы, канцлер, ваяводы (віленскі, троцкі, полацкі, кіеўскі, навагародскі, віцебскі, падляшскі, смаленскі), каштэляны (віцебскі і троцкі), старасты (жмудскі, луцкі, гародзенскі), абласныя князі, гетман найвышшы, гетман польны, маршалак земскі, маршалак дворны, падскарбі земскі і дворны, а таксама сталовыя і дворныя «вряднікі» (падчашы, крайчы, стольнік і інш.), сакратары, пісары, цівун віленскі, харужы земскі і дворны[3]. У гэты перыяд рада, адпаведна прывілею 1492 г., атрымала не толькі сваё юрыдычнае вызначэнне, але і перавагу над князем пры прыняцці дзяржаўных рашэнняў.

М. К. Любаўскі звяртае ўвагу і на кола асоб, з якіх папаўняўся склад рады. На падставе спіса шляхты 1528 г., а таксама пры дапамозе генеалагічных указальнікаў ён прыходзіць да высновы, што рада папаўнялася галоўным чынам з вельмі абмежаванага кола асоб (з родаў найбольш старажытных і заможных), аднак часам у яе склад уваходзілі за асабістыя заслугі і прадстаўнікі простага шляхецтва.

У сваю чаргу, Ф. І. Леантовіч пісаў, што сойм узнік на самым раннім пачатку фарміравання Вялікага княства Літоўскага[4]. Ім выказана думка, што ва ўдзельную эпоху ўзніклі соймы паноў-рады, якія называліся «зуполная рада», «з’еханне», «сойм», якія мелі галоўнай мэтай разгляд судовых спраў і пытанняў адносна кіравання дзяржавай. Падставай узнікнення такіх соймаў ён лічыць заснаванне трыбуналаў і іншых шляхецкіх судоў і адзначае, што ў Статутах 1566 і 1588 гг. аб асобных соймах паноў радных ужо не ўзгадваецца. Па справах усіх зямель (або некалькіх) склікаліся соймы вялікіх і

ўдзельных князёў, на якіх абмяркоўваліся галоўным чынам пытанні знешняй бяспекі. Напрыклад, такі сойм абмяркоўваў саюз Княства з нямецкім ордэнам пры Міндоўгу і Вітаўце, або пры Ягайлу ў 1379 г. сойм абмяркоўваў мытны дагавор з крыжакамі. Вучоны нават лічыць, што ў гэты перыяд існавалі і агульныя («вспольныя») соймы Вялікага княства з Польшчай, асабліва з пачаткам заключэння уній. У тым ліку і першая унія 1385 г. была заключана на агульным сойме, а з моманту заключэння Гарадзельскай уніі 1413 г. увогуле ўтвараюцца агульныя польска-літоўскія соймы. Ён гаворыць і аб існаванні ў адзначаны перыяд ваенна-палявых або лагерных соймаў і прыводзіць прыклад 1432 г., калі быў заключаны дагавор з нямецкім ордэнам[5]. Дарэчы, аб пераўтварэнні ў перыяд вайны ваеннага лагеру ў сойм піша таксама Н. А. Максімейка і прыводзіць прыклад такіх соймаў – у Навагародку ў 1502 г., у Менску – у 1507 г., у Віцебску – у 1562 г. і інш.[6]

Зразумела, пэўныя нарады вялікага князя з мясцовымі князямі мелі месца, таксама як і мелі месца сумесныя нарады з польскімі князямі ў сувязі з дагаворнымі адносінамі, аднак назваць іх у поўным сэнсе соймамі нельга, нават у параўнанні з мясцовымі старажытнымі соймамі. Таксама можна пагадзіцца і з тым, што ў гэты перыяд збіраецца і пашыранае пасяджэнне рады – пачатковы этап фарміравання сапраўднага сойма-парламента, аднак звязваць гэта з узнікненнем новых судоў нельга. Наадварот, узнікненню выбарных судоў і вальнага сойма садзейнічалі адны і тыя ж прычыны – сацыяльна-эканамічнае развіццё дзяржавы, працэс фарміравання саслоўнага падзелу грамадства, а ў сувязі з гэтым і патрабаванні сярэдняй і дробнай шляхты аб павелічэнні сваіх правоў і ўраўненні ў правах з буйнымі феадаламі.

Несумненна і тое, што ў працэсе складвання адзінай цэнтралізаванай дзяржавы на працягу XV ст. сойм, які спачатку ўяўляе сабой пашыранае пасяджэнне рады, паступова афармляецца як агульнадзяржаўны заканадаўчы орган дзяржавы. Канчаткова ён становіцца такім тады, калі асобныя землі падпарадкоўваюцца непасрэдна цэнтральнай уладзе і замест «абластных соймаў» узнікаюць мясцовыя шляхецкія соймікі, на якіх выбіраюцца дэлегаты ад паветаў на агульнадзяржаўны сойм, што і было замацавана Статутам 1566 г. У сувязі з гэтым нельга пагадзіцца з Ф. І. Леантовічам, які пісаў, што ўпершыню аб сойме, на які збіраліся паны радныя і земскія паслы, гаворыцца ў пастановах сойма 1576 г. У той перыяд, калі ўся шляхта атрымала права ехаць на сойм, шляхта парубежных тэрыторый павінна была

заставацца на месцы, таму вымушана была пасылаць на сойм сваіх прадстаўнікоў, і гэта стала правілам з 1512 г.

Ужо на стадыі фарміравання агульнадзяржаўны сойм складаўся з трох частак (станаў): вялікага князя, рады і прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя. Вучоныя разыходзяцца ў поглядах адносна паўнамоцтваў «станаў» і кампетэнцыі самога сойма. Так, Н. А. Максімейка лічыў, што вялікі князь і «станы» былі роўнымі бакамі, якія мелі патрэбу адзін у адным і таму шляхам узаемных саступак прыходзілі да пагадненняў. Прававая рэгламентацыя адносна таго, які бок павінен быў саступіць іншаму ў выпадку канфлікту паміж імі, адсутнічала, аднак дзейнічалі рэгулятары фактычныя (знешняя небяспека і інш.), якія прымушалі шукаць кампраміс[7].

М. К. Любаўскі сцвярджае, што на соймах дамінавалі паны радныя, а мясцовая шляхта дабілася значнага ўплыву толькі ў апошні перыяд кіравання Жыгімонта-Аўгуста. Склікаліся ж соймы першапачаткова не для заканадаўчай дзейнасці, а з мэтай вырашэння пытанняў знешняй абароны. Да Люблінскай уніі паўнамоцтвы вялікага князя былі абмежаваны з боку грамадства, і ён не мог не толькі самастойна, але і са згоды князёў і паноў радных (духоўных і свецкіх) пачынаць вайну, уводзіць серабшчыну і іншыя падаткі на ваенныя патрэбы. Ён мог гэта рабіць толькі са згоды ўсіх «станаў», у тым ліку і павятовых дэпутатаў, скліканых на вальны сойм, што потым і замацаваў Статут 1566 г.[8] Статут прама абавязваў вялікага князя любыя новыя пастановы прымаць толькі са згоды сойма, у сувязі з чым князь павінен быў у выпадку неабходнасці склікаць соймы па патрабаванні або просьбе рады ці шляхты[9].

Аднак няма сумнення ў тым, што і да праўлення Жігімонта-Аўгуста князь быў абмежаваны ў кампетэнцыі соймам. Напрыклад, у Статуце 1529 г. гаворыцца аб «ухвале земскай» адносна вызначэння колькасці ратнікаў[10]. У сувязі з гэтым М. К. Любаўскі правільна падкрэслівае, што «ухвала земская» і ўяўляла сабой пастанову сойма. Кампетэнцыя князя вызначалася патрэбамі жыцця, нормамі звычаёвага права, таму аб ёй не гаворыцца ў пастановах сойма да таго часу, пакуль не ўзнікла неабходнасць заканадаўчай рэгламентацыі. Навуковец, спасылаючыся на дакументальныя крыніцы, прыводзіць і іншыя таму пацвярджэнні. Напрыклад, паны-рада ў 1501 г. у пасланні да палякаў адмаўляюцца ад дагавора на той падставе, што на заключэнне яго не давалі згоды некаторыя землі, якія не мелі прадстаўнікоў на сойме 1501 г. Вялікі князь Жыгімонт у грамаце,

выдадзенай у 1528 г. у сувязі з выкупам гаспадарскіх маёнткаў, заяўляе, што ён не можа, не парушыўшы законаў, без згоды землеўласнікаў абкладваць іх сярэбшчынай (якая вызначалася толькі на соймах). У 1544 г. соймавыя «станы» просяць вялікага князя не пасылаць іх на ваенную службу па парадзе адных толькі паноў радных на той толькі падставе, што пры продках вялікага князя і пры ім самім абарона земская ўстанаўлівалася толькі на вальным сойме, куды запрашаліся ўсе паны радныя, княжаты, паняты, старасты, харужыя, шляхта «с которых призволеньем и радою завжды оборона была доконывана»[11]. На гэта звяртае ўвагу таксама Ф. І. Леантовіч[12].

Аб абмежаванасці ўлады вялікага князя соймам сведчыць і тое, што соймы часам склікаліся і ў яго адсутнасць (Віленскі сойм 1507 г., Навагрудскі 1538 г., Віцебскі 1562 г., Мінскі 1564 г. і інш.), хаця справы на іх вырашаліся не без уплыву князя. Паміж князем і «станамі» вялася перапіска, і ён праз паслоў ставіў пытанні, якія належала разгледзець на сойме, зацвярджаў прынятыя пастановы, даваў інструкцыі радным панам, каб яны «справовали и радили во всем згодливе так, как бы было его милости господарским добром и земским пожиточным»[13].

У першай палове XVI ст. соймы збіраюцца даволі часта. Так, М. К. Любаўскі налічвае ў перыяд княжання Жыгімонта Казіміравіча 26 вялікіх соймаў, кіруючыся пры гэтым не простым указаннем крыніц аб соймах, а ўказаннем на тое, што гэта былі вялікія соймы, або іншымі прыкметамі, якія сведчылі аб скліканні не адных паноў радных, але і іншых «станаў». К такім соймам ён адносіць вялікі Віленскі сойм 1508–1509 гг., вялікі сойм 1515–1516 гг. у Бярэсце, Віленскі сойм 1521 г. і інш.[14] Частае соймаванне пры гэтым князі было для шляхты палітычнай школай, на якой яна брала ўрокі ў радных паноў і ўцягвалася ў курс палітычнага жыцця. Гэтаму ж садзейнічалі і павятовыя соймікі, на якіх абмяркоўваліся не толькі мясцовыя справы, але і агульнадзяржаўныя, у сувязі з чым даваліся наказы абраным на сойм дэпутатам.

Такім чынам, сойм Вялікага княства Літоўскага як вышэйшы заканадаўчы орган дзяржавы афармляўся пастунова, на працягу XV – першай паловы XVI ст., паралельна з працэсамі складвання адзінай цэнтралізаванай дзяржавы і фарміравання саслоўнага падзелу грамадства. Менавіта канчатковая арганізацыя дзейнасці сойма і сведчыла аб завяршэнні гэтых працэсаў. Да канца XV ст. асобныя землі дзяржавы жылі сваімі звычаямі і кіраваліся ўласнымі «гаспадарамі», а аб'яд-

ноўваў іх вялікі князь, якому яны аддавалі частку сваіх паўнамоцтваў. Сойм становіцца агульнадзяржаўным органам тады, калі гэтыя землі падпарадкоўваюцца непасрэдна цэнтральнай уладзе і замест «абласных соймаў» узнікаюць мясцовыя шляхецкія соймікі, на якіх выбіраюцца па два дэлегаты (дэпутаты) ад паветаў на агульнадзяржаўны сойм, што і было замацавана канчаткова Статутам 1566 г.

Тыя змены, што адбыліся ў сацыяльна-палітычным і эканамічным жыцці дзяржавы ў 40–50-х гг. XVI ст., у тым ліку і правядзенне аграрнай рэформы, патрабавалі ўнясення зменаў у заканадаўства. У лістападзе 1551 г. у сувязі з просьбай дэпутатаў сойма вялікі князь Жыгімонт Аўгуст са згоды паноў рады вырашыў утварыць соймавую камісію з дзесяці асобаў (пяць католікаў і пяць праваслаўных) для перагляду Статута 1529 г. Перад імі ставілася задача тэкст першага Статута «добра обачити и разважити и выразумети то, чого бы потреба была прибавити альбо убавити, альбо отменити» і вынесці свае прапановы на наступны сойм.

Як бачым, у гэты перыяд змены ў закон уносяцца ўжо толькі соймам, які становіцца адзіным заканадаўчым органам дзяржавы, а для распрацоўкі праектаў законаў ствараюцца спецыяльныя соймавыя камісіі. Трэба адзначыць, што ў сувязі з прапановай выдаць новы закон, апрача беларускай мовы, адначасова на лацінскай, а многія лічылі, што «лаціна для іх непатрэбная і шкодная, і што ўсялякае зло было прынесена ў Літву гэтаю моваю», абмяркоўвалася і гэта пытанне. Галоўным кіраўніком камісіі па складанні Статута 1566 г. да часу сваёй смерці, г. зн. да 29 траўня 1565 г., быў выдатны беларускі дзяржаўны дзеяч, канцлер Вялікага княства Літоўскага, ваявода віленскі, маршалак земскі, стараста берасцейскі і ковенскі Мікалай Янавіч Радзівіл Чорны. Трэба падкрэсліць і тое, што праект новага Статута сістэматычна пачынаючы з 1561 г. абмяркоўваўся на соймах, што сведчыць аб актыўным удзеле дэпутатаў сойма ў яго падрыхтоўцы.

Уключэнню ў праект закона новых прагрэсіўных палажэнняў, у тым ліку і адносна ўдасканальвання дзейнасці сойма, садзейнічалі сістэматычныя, настойлівыя патрабаванні шляхты. Напрыклад, на сойме 1565 г. шляхта зноў падымала пытанне аб рэфармаванні сойма. Прыняты на сойме Віленскі прывілей 1565 г. заканадаўча замацаваў правіла склікання павятовых соймікаў за чатыры тыдні перад вальным соймам і абмеркавання на іх пытанняў, якія былі пазначаны ў вялікакняжацкіх лістах, а таксама правіла выбрання на сойм двух павятовых дэпутатаў. Адносна гэтага закона права заканадаўчай

ініцыятывы, якое пэўны час належала вялікаму князю, надавалася сойму. Такім чынам упершыню была нарматыўна рэгламентавана магчымасць самастойнай заканадаўчай ініцыятывы вальных соймаў. Дэпутатам, якія былі абраныя на павятовых сойміках, даваліся пісьмовыя інструкцыі і даручэнні заяўляць і адстойваць на соймах тыя пытанні, якія былі вызначаны на павятовых сойміках.

Паступова ўдакладняўся і склад сойма. Амаль да сярэдзіны 60-х гг. XVI ст. не існавала агульных законаў, якія б вызначалі склад сойма (соймавых «станаў»). Асабісты склад вальных соймаў вызначаўся пры іх скліканні спецыяльнымі ўрадавымі распараджэннямі. Нават Статут 1566 г. гаворыць аб гэтым у агульных рысах – сойм складаецца, акрамя паноў радных, з «всих станов, сойму належачих», «всих станов подданных панства нашого», «всих земель того панства нашого» і г. д. (раздз. III, арт. 5, 6 і інш.). Перш за ўсё ў склад сойма ўваходзілі ўсе вышэйшыя свецкія і духоўныя асобы – члены рады, дворныя ўраднікі і кіраўнікі мясцовай адміністрацыі, а таксама князі і паны харугоўныя (буйныя землеўладальнікі, якія не станавіліся падчас вайны са сваімі атрадамі пад агульнай харугвай (сцягам) павета, а вялі свае «почты» пад уласнай харугвай (раздз. III, арт. 7, 11). Менавіта гэтыя асобы скліканіся на сойм персанальнымі лістамі, іншыя ж, менш значныя, асобы (у тым ліку і прадстаўнікі павятовай шляхты) – агульнымі лістамі. Паны радныя і буйныя феадалы складалі на соймах асобную групу («лавіцу», «кола»), нарады якой праходзілі асобна ад «шляхецкага кола». Пасля гэтых нарад «станы» зыходзіліся разам для выпрацоўкі канчатковых пастаноў сойма.

Важным было тое, што ў адрозненне ад папярэдняга звода законаў Статут 1566 г. даволі дакладна рэгламентаваў дзейнасць сойма. Так, у ім гаварылася: «При том теж уставуем, с призволеньем рад наших духовных и свецких и зо виси станы сойму належачыми... складати соймы вальные в том же панстве Великом Князстве Литовском завжды, коли колко того будеть потреба» (раздз. III, арт. 6).

Кампетэнцыя вальнага сойму выпрацоўвалася на працягу стагоддзяў пад уплывам практыкі дзейнасці «абластных соймаў». На сойме абмяркоўваліся кандыдатуры і выбіраліся вялікія князі, вырашаліся фінансавыя і падатковыя пытанні, міжнародныя справы адносна саюзаў, дагавораў, войнаў з іншымі дзяржавамі, разглядаліся некаторыя судовыя справы, а самае галоўнае – абмяркоўваліся і прымаліся заканадаўчыя акты. Статутам 1566 г. было замацавана правіла, адносна якога ўсе законы дзяржавы павінны прымацца толькі на сойме, па

згодзе ўсіх «станаў». Закон рэгламентаваў таксама дзейнасць павятовых соймікаў, якія склікаліся за чатыры тыдні перад соймам. У арт. 5 раздз. 3 гаварылася: «…на тых местцах и воеводствах нижей суть написаных и постановленных, которые мають обирати послов своих <…> по две особы, послати их на сойм». На сойміках абмяркоўваліся мясцовыя справы і агульнадзяржаўныя патрэбы, даваліся наказы дэпутатам і права «на вальном сойме поступовати и кончыти тые и иншые припалые речи водле часу и потребы» (раздз. III, арт. 5).

Статут 1588 г. удасканаліў дзейнасць сойма і павятовых соймікаў. Важным было тое, што кароль абавязваўся не парушаць дзеючых прывілеяў, уставаў, земскіх вольнасцей і старых звычаяў, а новыя законы і ўставы павінны былі прымацца толькі на сойме з ведама паноў радных і «произволенья всих станов, сойму належачих»[15]. Гаварылася таксама, што на павятовыя соймікі склікаюцца мясцовыя біскупы, ваяводы, каштэляны і земскія ураднікі, а таксама князі, паны і шляхта. Шляхта павінна была своечасова з'явіцца на сойм – да першага дня сесіі. Адносна тых, хто не з'явіўся, дзейнічала правіла: падпарадкоўвацца тым пастановам, якія былі прыняты без іх удзелу (раздз. III, арт. 6). Пачатак працы соймікаў і пытанні для абмеркавання на іх вызначаліся ў вялікакняжацкіх лістах (універсалах), якія пасылаліся ў паветы за два тыдні да адкрыцця соймікаў. Аб гэтым мясцовая адміністрацыя праз возных павінна была апавясціць усе «станы»: «А вряд маеть тые листы розсылати через возных поветовых до панов рад, до княжат, панят, врядников земских и поветовых и до иншых станов народу шляхетского, до кого перед тым стародавна листы соймовые с канцеляреи нашое посылывано до домов их, мають носить» (раздз. III, арт. 6). Праца соймікаў абнародавалася шляхам вывешвання ў людных месцах аб'яваў: «А для всих посполите в местех, местечках наших, на торгох и пры костелех парафеяльных обволывати и копеи з листов наших прибивати» (раздз. III, арт. 6).

Статут 1588 г. вызначыў таксама іерархію службовых асоб, якія ўдзельнічалі ў працы соймікаў: першае месца займаў мясцовы ваявода, затым ішоў каштэлян (а дзе яго не было – «маршалок оного повету»), потым падкаморы, харужы, суддзя, падсудак, войскі, стольнік, падстолій, земскі пісар, затым ішлі ўраднікі, панове і астатняя шляхта (раздз. III, арт. 6). Іншыя прадстаўнікі свабоднага насельніцтва (мяшчане, валасныя людзі, татары, яўрэі) не ўдзельнічалі ў сойміках і пасяджэннях соймаў, а маглі толькі заяўляць на соймах аб сваіх патрэбах (раздз. IV, арт. 1, 2, 8; раздз. IX, арт. 1, 6, 7).

Ф. І. Лентовіч адзначае, што пасля Люблінскай уніі пачынаюць збірацца перадсоймавыя соймікі (партыкулярныя), якія разглядалі княжацкія «прапазіцыі» і выбіралі дэпутатаў на сойм. Склікаліся таксама «галоўныя» або «генеральныя» соймікі, на якія з'язджаліся са ўсіх паветаў паны радныя і «паслы земскія» для абмеркавання соймавых пытанняў[1].

Па Статуту 1588 г. агульны з'езд паноў радных і земскіх паслоў павінен быў склікацца ў Слоніме за два тыдні да сойма, аб чым спецыяльнымі лістамі апавяшчалася мясцовая адміністрацыя за шэсць тыдняў да вальнага сойма (раздз. III, арт. 6). Закон даволі дакладна вызначаў парадак дзейнасці сойма, у тым ліку адносна таго, якія месцы займаюць павятовыя дэпутаты – «послове земские местца и вота свои мають мети водле порадку воеводств и поветов, яко которые по которих местца свои звыклые мають», а таксама, якім парадкам яны галасуюць (раздз. III, арт. 6, 7).

У Статуце гаварылася таксама, што ўсе пастановы сойма «мають послове на писме за печатью нашою до повету своего принести и то ку захованью при книгах земских вряду земскому подати, также для ведомости тое речы, и до книг гродских дати то вписати» (раздз. III, арт. 9). Праз чатыры тыдні пасля заканчэння сесіі вальнага сойма ў паветах павінны былі склікацца так званыя «рэляцыйныя» соймікі для заслухоўвання справаздачы («рэляцыі») паслоў, якія прысутнічалі на сойме.

Аб удасканальванні парламентарызму і аб тым, што палітычным цэнтрам Вялікага княства Літоўскага былі беларускія землі, сведчыць артыкул Статута 1588 г., у якім рэгламентавалася сума грошаў, вызначаемая дэпутатам сойму «на страву»: «Виленьским, Ошменьским Лидским, Вилькомирским, Троцким, Упитским, Полоцким, Новгородским, Витебским, Оршаньским, Мстиславским, Меньским послом – сто шестьдесят коп грошей; Браславским, Городеньским, Ковеньским, Волковыйским, Слонимским, Берестейским, Пиньским, Мозырским Речицким послом – сто двадцать коп грошей; Земля Жомойтская своим послом – двесте коп грошей» (раздз. III, арт. 7).

Ф. І. Леантовіч падзяляе соймы пасля Люблінскай уніі на ардынарныя і экстраардынарныя, першыя з якіх збіраліся адзін раз у два гады, а другія – па тэрміновых пытаннях. У сувязі з тым, што ў Польшчы было да 45 паветаў, і ў склад сойма па агульным станам – сенатарскаму і пасольскаму – уваходзіла 270 асоб, а ад Вялікага княства Літоўскага – каля 85 асоб, польскае прадстаўніцтва мела перавагу і большую магчымасць вырашаць справы ў бок уласных інтарэсаў.

Нягледзячы на Люблінскую унію, Вялікае княства Літоўскае працягвала захоўваць свой суверэнітэт, аб чым сведчаць адасобленасць тэрыторыі, уласныя фінансы, дзяржаўны апарат, армія, прававая і судовая сістэмы. Менавіта гэта і замацаваў Статут 1588 г. Агульнымі з Польшчай дзяржаўнымі ўстановамі былі кароль, які згодна з Генрыкаўскімі артыкуламі і Статутам 1588 г. не валодаў ні заканадаўчай, ні выканаўчай уладаю, і агульны (вальны) сойм. З 1652 г. кожны дэпутат сойма валодаў правам накласці на любое рашэнне і ўсю работу сойма забарону – «свабоднае вета» («liberum veto»), што вяло да бяссілля сойма. З 55 соймаў, што склікаліся у 1652–1764 гг., 42 былі сарваны накладаннем «вета»[16]. Дэпутаты з паветаў абавязаны былі прытрымлівацца інструкцый павятовых соймікаў, што ў пэўнай ступені забяспечвала адасобленасць і самастойнасць Вялікага княства Літоўскага. Пастановы сойма Рэчы Паспалітай мелі сілу закона ў Вялікім княстве толькі па асноўных агульнадзяржаўных пытаннях: аб функцыях караля і сойма, аб дзяржаўных злачынствах, наданні шляхецтва і некаторых іншых.

З 1673 г. у выпадку смерці караля збіраліся т. зв. генеральныя канфедэрацыі для вызначэння парадку выбару кандыдатаў на пасаду новага караля. Падчас каранацыі збіраліся каранацыйныя соймы, а пасля іх – асобныя канфедэрацыі для заключэння Пакта канвента. Апошнія часам аб’ядноўваліся з каранацыйнымі соймамі. У 1673 г. было прынята рашэнне склікаць два ардынарных соймы ў Варшаве, а трэці – у Гродне. Рашэнні, прынятыя на сойме, мелі сілу закона, і кароль не меў права іх адмяніць. Соймавымі пастановамі каралю было нададзена права карыстацца дзяржаўнай пячаткай, якая захоўвалася ў канцлераў і падканцлераў (Польшчы і Вялікага княства), а таксама мець ваенную ахову (гвардыю) у складзе не звыш 800 ратнікаў, на ўтрыманне якой сойм прадугледжваў спецыяльныя расходы.

У другой палове XVIII ст. у Рэчы Паспалітай разгарнулася вострая палітычная барацьба паміж прыхільнікамі рэформаў і рэакцыйнымі коламі каталіцкага духавенства і магнатаў. З мэтай удасканалення дзяржаўнага ладу на сойме прымаецца шэраг заканадаўчых актаў (Закон аб павятовых сойміках, Закон аб гарадах і інш.). Вяршыняй заканадаўчай дзейнасці сойма стала прыняцце Канстытуцыі 1791 г., якая замацавала палажэнне аб тым, што «ўсякая ўлада ў чалавечым грамадстве бярэ свой пачатак з волі народа» і павінна складацца з трох уладаў – заканадаўчай, выканаўчай і судовай. Кароль надзяляўся шырокімі паўнамоцтвамі, аднак усе акты караля пацвяр-

джаліся подпісам адпаведнага міністра, які і адказваў перад соймам за прынятыя акты.

Двухпалатны сойм Рэчы Паспалітай у складзе палаты дэпутатаў (паслоў) і палаты сенатараў пад старшынствам караля з'яўляўся ўжо сапраўдным парламентам. Палата дэпутатаў, дзе павінны былі абмяркоўвацца ўсе законапраекты, абвяшчалася святыняй заканадаўства. Сенат, які складаўся з каталіцкіх епіскапаў, ваяводаў, каштэлянаў і міністраў пад старшынствам караля, мог ухваліць або адкласці да паўторнага пасяджэння сойма праект закона, які быў прыняты палатай дэпутатаў. У выпадку адхілення праекта палаты збіраліся разам, і рашэнне прымалася простай большасцю галасоў. Правіла «liberum veto» адмянялася. У Канстытуцыі гаварылася, што яна падлягае перагляду толькі праз 25 гадоў. Аднак ў 1795 г. Рэч Паспалітая перастала існаваць, а беларускія землі былі далучаны да Расійскай імперыі.

---

[1] АЗР. СПб., 1848. Т. 2. № 70.

[2] Любавский М. К. Литовско-Русский сейм: опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства. М., 1900. С. 399.

[3] Тамсама. С. 335–337.

[4] Леонтович Ф. И. Веча, сеймы и сеймики в Великом княжестве Литовском // Журнал Министерства народного просвещения. 1910. № 2, 3. С. 236.

[5] Тамсама. С. 253–254.

[6] Максимейко Н. А. Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 года. Харьков, 1902. С. 92.

[7] Тамсама. С. 98.

[8] Любавский М. К. Указ. соч. С. 368.

[9] Статут Великого княжества Литовского 1566 года // Временник Общества истории и древностей российских. Кн. 23. Раздз. III, арт. 6.

[10] Статут Великого княжества Литовского 1529 года. Мн., 1960. Раздз. II, арт. 1.

[11] Любавский М. К. Указ. соч. С. 308.

[12] Леонтович Ф. И. Указ. соч. С. 253.

[13] Максимейко Н. А. Указ. соч. С. 77.

[14] Любавский М. К. Указ. соч. С. 182, 205.

[15] Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года: Тэксты. Давед. Камент. Мн., 1989. Раздз. 3, арт. 15.

[16] Васілевіч Р. А., Доўнар Т. І., Юхо І. А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі. Мн., 2001. С. 101.